# ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ ВКЛ У ТВОРЧАСЦІ АДАМА МІЦКЕВІЧА І ЯНА ЧАЧОТА

***Суслянкоў Андрэй Андрэевіч, Рэспубліка Беларусь***
*Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова,*
*Рэспубліка Беларусь, г. Магілёў*
*Навуковы кіраўнік – к.ф.н. дацэнт Чмарава М.І.*

*Анатацыя.* В статье анализируется художественное осмысливание А. Мицкевичем и Я. Чачотам исторического прошлого Великого княжества Литовского.

*Ключавыя словы: Адам Міцкевіч, Ян Чачот, ВКЛ, вобраз, гістарычнае мінулае.*

Зварот да гістарычнага мінулага Вялікага княства Літоўскага ў творчасці А. Міцкевіча і Я. Чачота ў многім быў абумоўлены тым складаным становішчам, у якім апынулася дзяржава ў XIX стагоддзі. Як заўважае Г. Праневіч, “тераічная гісторыя Вялікага княства Літоўскага актуалізавалася ў творчасці Міцкевіча і іншых паэтаў філамацкага кола ў сувязі з нацыянальна – вызваленчым рухам народаў былой Рэчы Паспалітай супраць расійскага самаўладдзя” [7, с. 26].

Акрамя гэтага, на думку А. Мальдзіса, “ідэалізацыі мінулага ў многім садзейнічаў і ўплыў літаратуры польскага народа, які жыў ва ўмовах, у многім падобных на беларускія. І там, і тут праслаўленне Рэчы Паспалітай бралася на ўзбраенне патрыятычнымі сіламі, якія сучаснае і будучае часта асэнсоўвалі ў катэгорыях мінулага” [1, с. 59].

Яшчэ не было канкрэтнага ўяўлення аб будучыні дзяржавы, але ўсе добра ведалі яе слаўнае мінулае. Таму, каб выклікаць у насельніцтва пачуцці глыбокага патрыятызму і шчырай адданасці роднаму краю, пісьменнікі нярэдка імкнуліся ў сваіх творах да ідэалізацыі, услаўлення мінулага Літоўскай дзяржавы. Рабілі яны гэта праз увядзенне ў тэкст вобразаў мужных і верных сваёй Радзіме ліцвінаў і ліцвінак.

Для А. Міцкевіча і Я. Чачота зварот да гістарычнага мінулага Бацькаўшчыны быў відавочным і па прычыне іх уваходу ў асяроддзе філаматаў, якія вялікую ўвагу надавалі выучэнню роднага краю.

Акрамя таго, культ гісторыі, імкненне да ўзвышэння гераічнасці эпохі Літоўскай дзяржавы былі неад’емнай часткай эстэтыкі рамантызму.

Пісьменнікі XIX стагоддзя ўсім сэрцам жадалі для роднай зямлі той велічы і магутнасці, што былі характэрныя для часоў Міндоўга, Гедыміна, Вітаўта [7, с. 29].

Вялікая цікавасць да гістарычных асоб выяўляецца ў творчасці Я. Чачота, якому глыбокае вывучэнне свайго краю дапамагло стварэнню шэрагу гістарычных песень, у якіх ён, грунтуючыся на матэрыялах “Хронікі

Стрыйкоўскага”, у вершаванай форме выклаў гісторыю Беларусі з сівой мінуўшчыны да 1434 года.

Галоўную прычыну напісання цыклу гістарычных песень Я. Чачот характарызуе ў прадмове: “Як мне здаецца, абуджэнне еўрапейскіх народаў не дасць ім згубіцца ў гісторыі, зліцца ў нейкую супольнасць. Кожны з іх шукае ў попеле мінуўшчыны сваю славу, свае асаблівасці, даказвае, што і ён заслугоўвае пашаны з боку іншых народаў. Дык няхай жа ні ў кога не выкліча незадаволенасці, калі і ліцвін успомніць сваю даўнюю славу, каб сціпла, па – хрысціянску, расказаць пра яе” [8, с. 126].

Я. Чачот узнаўляе вобразы князёў Вялікага княства Літоўскага – сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы. Аўтар падкрэслівае, што дзякуючы ім краіна была вядомая ва ўсім свеце. Вось што, напрыклад, гаворыць Чачот пра аднаго з Вялікіх князёў Літоўскіх: *«Час успомніць нам Рынгольда // Альгімунда сына, // За якім славутай стала // Наша ўся краіна»* [8, с. 127].

Кожны верш-песня ўяўляе сум паэта па былым слаўным часам, па сапраўдным сынам Літоўскай дзяржавы, якіх так не хапала ў часы Я. Чачота. Пра гэта сведчаць наступныя радкі з песні “Альгерд, Вялікі князь Літоўскі. 1330 – 1345 г.г. ”: *«Каб усе былі такія, // Што сядзяць на троне, // На зямлі, крывёй палітай, // Быў бы мір дасёння»* [8, с. 143].

У песні ж “Віцень, Вялікі князь Літоўскі. 1283 – 1315 г.г.” закладзены аўтарскі ідэал дзяржаўнага кіраўніка: *«Ды на трон Літвы сеў Віцень, // Князь рашучы, мудры, смелы. // Крыжакоў ён біў у сечах, // Ад літвы адвёў іх стрэлы»* [8, с. 133].

Што тычыцца творчасці А. Міцкевіча, то тэма Айчыны – Літвы ўзнікла ўжо на раннім этапе яе развіцця. Адным з першых твораў на гістпрычную тэму ў спадчыне паэта з’яўляецца апавяданне з літоўскіх часоў “Жывіла” (1819), што пераносіць чытача ў ваколіцы старажытнага Наваградка, Слоніма і Ліды, дзе панаваў магутны і грозны літоўскі князь Карыят, які меў прыгожую дачку Жывілу. Рамантычная гісторыя кахання Жывілы і рыцара – ваяводы Парая заканчваецца трагічным выбарам Жывілы на карысць Айчыне: яна забівае каханага, які прывёў чужое войска русаў у родны горад, каб вызваліць яе з бацькоўскага палону, ягоным жа мячом. Жывіла вызваляе родны горад, а сама гіне [7, с. 25 – 26].

Такім чынам, у апавяданне ўводзіцца прыём самаахвяравання гераіні як доказ яе святой любові да Радзімы. Аўтар услаўляе мужнасць маладой ліцвінкі.

Гэтая тэма знойдзе саё развіццё ў паэме “Гражына” (1823), літоўскай аповесці з часоў напярэдадні Грунвальдскай бітвы, якая, як заўважае У. Мархель, “была напісана як з мэтай падключэння гістарычных урокаў да сучаснай палітычнай сітуацыі і ўздыму незалежніцкага духу чытача, так і дзеля асэнсавання ўзроўню маральнасці гонару і славалюбства, якія ўступаюць у супярэчнасць з інтарэсамі дзяржавы і нават прыглушаюць пачуццё патрыятызму” [3, с. 75].

Вобраз Гражыны ў адпаведнасці з фальклорнай традыцыяй прадстаўлены ў іпастасі дзевы – ваіцельніцы і спалучае ў сабе шэраг рысаў старажытных язычніцкіх бостваў: *«З твару падобна да мужа нямала, // Сэрцам таксама нагадвала мужа. // Верацяном ці іглой пагарджала, // Але затое любіла аружжа»* [6, с. 92].

У творы заяўлены і канкрэтны сакральны цэнтр, што ўвасабляе краіну, якую сваім жыццём абараніла маладая ліцвінка, - гэта замак “у месяца срэбным зіхценні” ля Наваградка [4, с. 193].

Ужо з названых вышэй твораў зразумела, што ўвагу А. Міцкевіча вельмі прыцягвала гісторыя беларускага народа і асабліва выдатныя яе постаці. Так у вершы “Бульба” ён добрым словам узгадвае Міндоўга, які заснаваў Вялікае княства Літоўскае. Гістарычны сюжэт з жыцця гэтага княства ляжыць у аснове паэмы “Конрад Валенрод” – гэта барацьба ліцвінаў з крыжакамі. Герой паэмы, Вальтар Альфа, у дзяцінстве трапіў у палон да крыжакоў і быў выхаваны імі: *«Апроч таго, што пад крыжовым сцягам // Праславіў маладосць сваю аружжам, // Над іншымі яго ў тым перавага, // Што ён набожным быў і сціплым мужам»* [5, с. 201].

Але “пад імем нямецкім білася сэрца літвіна”. І, як адзначае В. Чаропка, “туга Вальтара па страчанай Айчыне – гэта туга самога Міцкевіча”: *«І яшчэ саладзйшы выраз: каханне, якому // На зямлі няма роўных, апроч слова – “Айчына»* [2, с. 435].

На аснове прыведзеных вышэй прыкладаў і характарыстык можна зрабіць выснову, што страта дзяржаўнасці і былой магутнасці ў выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай вымушала пісьменнікаў XIX стагоддзя шукаць яе прычыны, звяртацца як ў думках, так і ў сваёй творчасці да гістарычнага мінулага Вялікага княства Літоўскага. Выключэннем не сталі ні А. Міцкевіч, ні Я. Чачот. У абодвух паэтаў яскрава выявіўся арыгінальны, непаўторны погляд на мінулае роднай дзяржавы, увядзенне яе ў сакральную сферу і шчырая вера ў магчымасць вяртання страчанай Радзімы. Адсюль і перавага ў іх творчасці героіка-патрыятычнага зместу, што ў сваю чаргу аказала вялікі ўплыў на станаўленне новай беларускай літаратуры і выпрацоўку беларускай нацыянальнай ідэі.

Літаратура:

1. Мальдзіс, А. Творчае пабрацімства (бел. – пол. літ. узаемасувязі ў XIX ст.) / А. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966. – 158 с.

2. Мархель, У. І. Прадвесце: Бел. – пол. літ. узаемадзеянне ў п. п. XIX ст. / У. І.Мархель. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 111 с.

3. Мархель, У. І. “Ты як здароўе…”: Адам Міцкевіч і тэндэнцыі адраджэння беларускай літаратуры / У. І. Мархель; НАН Беларусі, Ін – т літаратуры імя Янкі Купалы. – Мінск: Беларуская навука, 1998. – 125 с.

4. Марціновіч, А. Лятуць дзікія гусі / А. Марціновіч // Хто мы, адкуль мы… – Мінск, 2007. – С. 140 – 141.

5. Міцкевіч, А. Гражына: Вершы і паэмы: з пол. / А. Міцкевіч; уклад І. Дабрыян. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 254 с.

6. Навасельцава, Г. Вобраз Маці – Радзімы ў творчасці А. Міцкевіча і Я. Баршчэўскага / Г. Навасельцава // Acta Albaruthenica: навук. зб .; пад агул. рэд.М. Хаўстовіча, А. Баршчэўскага, С. Запрудскага. – Мінск, 2005. - Вып. 5. – С. 90 – 94.

7. Праневіч, Г. М. Старая Літва ў духоўных пошуках А. Міцкевіча / Г. М. Праневіч // Вечныя праблемы і вобразы ў творчасці А. Міцкевіча. – Брэст, 1998. – С. 24 – 31.

8. Чачот, Я. Свіцязь: Выбраныя творы / Я. Чачот; склад. Я. Саламевіч; прадм., пер. з пол. мовы і камент. К. Цвіркі. – Мінск: БелЭн, 1999. – 320 с.